View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE



**УДК 904**

# МАТЭРЫЯЛЫ ДА КАРТЫ ПАХАВАЛЬНЫХ ПОМНІКАЎ БЕЛАРУСКАГА ПАДЗВІННЯ XIV – XVIII СТАГОДДЗЯЎ

***В.У. ЧАРАЎКО***
***(Полацкі дзяржаўны універсітэт)***

*Вывучэнне пахавальных помнікаў дае інфармацыю аб асаблівасцях матэрыяльнай, а ўскосна – і духоўнай культуры людзей мінулага. Артыкул прысвечаны пытанню картаграфавання пахавальных помнікаў Беларускага Падзвіння XIV – XVIII стагоддзяў. Перыяд XIV – XVIII стагоддзяў з’яўляецца перспектыўным для вывучэння з прычыны недастатковай вывучанасці пахавальных помнікаў гэтай эпохі. У ходзе падрыхтоўчага этапа былі ўдакладнены межы даследуемага рэгіёну. На падставе абагульненай інфармацыі складзены спіс пахавальных помнікаў, які налічвае каля сотні пазіцый. Улічаны такія катэгорыі аб’ектаў, як познесярэднявечныя курганныя пахаванні, курганна-жальнічныя могілкі, магілы з каменнымі надмагіллямі і крыжамі, пахаванні ўнутры культавых пабудоў, а таксама памінальныя курганы. Вынікам стала «Карта пахавальных помнікаў Беларускага Падзвіння XIV – XVIII стагоддзяў». Карту плануецца ўдакладняць з улікам вынікаў новых археалагічных адкрыццяў.*

**Уводзіны.** Неад’емным элементам матэрыяльнай і духоўнай культуры з’яўляюцца пахавальныя помнікі. Іх вывучэнне дае магчымасць атрымаць інфармацыю аб асаблівасцях пахавальнага рытуалу, ступені яго трываласці і тэндэнцыях развіцця, залежнасці ад сацыяльнай і канфесійнай прыналежнасці пахаванага і г.д. Пахавальныя помнікі XIV – XVIII стагоддзяў на тэрыторыі Беларусі амаль не даследаваны. Між тым перыяд позняга сярэднявечча і ранняга новага часу насычаны разнастайнымі этнічнымі, сацыяльнымі і канфесійнымі працэсамі, якія павінны былі аказваць уплыў нават на надзвычай кансерватыўную пахавальную традыцыю. Беларускае Падзвінне ўяўляе асаблівую цікавасць для вывучэння, улічваючы культурную спадчыну полацкага перыяду, памежны статус рэгіёну з балцкімі і рускімі землямі, інтэнсіўнасць грамадскіх, палітычных і канфесійных працэсаў.

Неабходнай часткай вывучэння пахавальных помнікаў Беларускага Падзвіння XIV – XVIII стагоддзяў з’яўляецца іх картаграфаванне. Карта пахавальных помнікаў дазволіць праводзіць іх візуальны аналіз: убачыць узаемнае размяшчэнне, скласці ўяўленне аб іх лакалізацыі адносна прыродных аб’ектаў, выявіць рэгіёны максімальнай канцэнтрацыі. Картаграфаванню папярэднічаў падрыхтоўчы этап, на якім былі ўдакладнены межы вывучаемага рэгіёну і сістэматызаваны звесткі аб вядомых археалагічных помніках.

**Асноўная частка**

**Арэал даследавання.** Беларускае Падзвінне (Паазер’е) – гісторыка-этнаграфічны рэгіён Беларусі ў сярэднім і верхнім басейне Заходняй Дзвіны. На захад рэгіён распасціраецца да возера Нарач, на поўдні ўмоўная мяжа праходзіць па лясных масівах на поўнач ад Лагойска і Барысава і далей – па водападзеле Заходняй Дзвіны і Дняпра [1, с. 372].

На поўначы, усходзе і часткова на захадзе мяжа Беларускага Падзвіння вызначаецца дакладна з прычыны супадзення з дзяржаўнай мяжой Рэспублікі Беларусь, чаго нельга сказаць аб паўднёвым рубяжы. Паўднёвая мяжа Беларускага Падзвіння павінна разглядацца хутчэй як буферная або кантактная зона, чым як лінія, што адпавядае вызначэнню рэгіёну як гісторыка-этнаграфічнага.

Пры картаграфаванні тэрыторыі Беларускага Падзвіння, з невялікімі ўдакладненнямі ў адпаведнасці з водападзелам Заходняй Дзвіны, за аснову была ўзята карта (мал. 1) з кнігі В.С. Цітова «Этнаграфічная спадчына» [2, с. 56].

У Беларускае Падзвінне, такім чынам, амаль цалкам уваходзіць Віцебская вобласць, за выключэннем паўднёва-заходняй часткі Пастаўскага раёна, паўднёва-ўсходняй часткі Сенненскага, Аршанскага, большай часткі Талачынскага і Дубровенскага раёнаў. Да рэгіёну адносяцца таксама ўсходняя частка Мядзельскага, паўночна-ўсходняя частка Вілейскага, поўнач Лагойскага, Барысаўскага і Крупскага раёнаў Мінскай вобласці.

**Гістарыяграфія.** Ініцыятыва ў складанні археалагічнай карты Падзвіння (Віцебскай губерні) належыць А.М. Семянтоўскаму [3, с. 273]. Падзяліўшы помнікі на некалькі катэгорый, ён аднёс пахаванні да «земляных помнікаў». У «Беларускіх старажытнасцях» (1890) А.М. Семянтоўскага сустракаем інфармацыю аб знаходках пахаванняў у час будаўнічых работ у Віцебскім павеце і раскопках М.Ф. Кусцінскага ў Лепельскім павеце [4, с. 27 – 28]. М.Ф. Кусцінскі таксама вёў працу па складанні карты археалагічных помнікаў Віцебшчыны, аднак яна не была апублікавана [3, с. 274]. Картаграфаваннем археалагічных помнікаў Беларускага Падзвіння займаўся Ф.В. Пакроўскі. Складзеныя ім «Археалагічная карта Віленскай губерні» (1893) і «Археалагічная карта Ковенскай губерні» (1899) ахопліваюць некалькі катэгорый аб’ектаў. Цікавасць выклікаюць такія з іх, як «курганы», «могільнікі, могілкі», «знаходкі костак» [5; 6].

Інфармацыі аб пахавальных помніках XIV – XVIII стагоддзяў там няшмат. Работу над археалагічнай картай Віцебскай губерні вёў Е.Р. Раманаў. У «Кароткіх указаннях для здзяйснення археалагічных экскурсій сярэднімі навучальнымі ўстановамі Віленскай навучальнай акругі» ён паведамляў, што інфармацыю можна знайсці ў яго неапублікаваных матэрыялах да археалагічнай карты Віцебскай губерні [7, с. 1]. На жаль, згаданыя матэрыялы не толькі засталіся неапублікаванымі, але і былі страчаныя [3, с. 274].




Мал. 1. Беларускае Падзвінне

У 1920-х гадах з разгортваннем у Беларусі краязнаўчага руху з’явіліся новыя магчымасці для збору інфармацыі аб пахавальных помніках. У адным з нумароў краязнаўчага часопіса «Наш край» за 1926 год быў надрукаваны складзены М.В. Мялешкам «Апытальны ліст да збірання народных вераванняў і ўяўленняў, звязаных з каменем, і вестак аб каменных помніках гісторыка-археалагічнай значнасці» [8, с. 43 – 45]. Прапаноўвалася звяртаць увагу на «старасвецкія могілкі», жальнікі, каменныя надмагіллі з выбітымі надпісамі і знакамі, каменныя крыжы, указваць іх форму, памеры і г.д., занатоўваць звесткі аб знішчаных пахавальных помніках, фіксаваць народныя павер’і [8, с. 44 – 45]. У 1930 годзе пабачыла свет археалагічная карта Ушацкага раёна, складзеная І.А. Сербавым [3, с. 274].

Крокам наперад у справе складання археалагічнай карты Беларускага Падзвіння стала публікацыя Л.В. Аляксеева «Археалагічныя помнікі эпохі жалеза ў сярэднім цячэнні Заходняй Дзвіны (матэрыялы да археалагічнай карты Віцебскай вобласці БССР)» (1959) [3]. Аўтар сістэматызаваў вялікі аб’ём інфармацыі аб помніках, у тым ліку пахавальных. У 1971 годзе Г.В. Штыхавым была выдадзена «Археалагічная карта Беларусі» [9]. Дапоўніўшы ранейшыя звесткі данымі пазнейшых археалагічных адкрыццяў, Г.В. Штыхаў абагульніў усю вядомую на той момант інфармацыю адносна археалагічных помнікаў Беларускага Падзвіння, у тым ліку і пахавальных. У 1996 годзе карту распаўсюджання курганна-жальнічных могільнікаў у Полацкай зямлі склала Л.У. Дучыц [10, с. 42]. Усе звесткі аб пахавальных помніках Беларускага Падзвіння XIV – XVIII стагоддзяў па стане на 2001 год былі падсумаваны Л.У. Дучыц і В.М. Ляўко ў чацвёртым томе акадэмічнай «Археалогіі Беларусі» [11, с. 124 – 139].

Пры складанні карты пахавальных помнікаў Беларускага Падзвіння XIV – XVIII стагоддзяў была выкарыстана інфармацыя, назапашаная ў ходзе этнаграфічных экспедыцый дацэнтам Полацкага дзяржаўнага універсітэта У.А. Лобачам[1] і атрыманая ў ходзе раскопак і разведак археолагамі Д.У. Дукам [24; 28 – 31], Л.У. Дучыц [15; 17; 32], М.В. Клімавым [25], В.М. Ляўко [19 – 20; 22], З.А. Харытановіч [23][2].

У выніку апрацоўкі інфармацыі аб пахавальных помніках Беларускага Падзвіння XIV – XVIII стагоддзяў быў складзены іх спіс (табліца), які налічвае каля 100 пазіцый. Пахавальныя помнікі згрупаваныя па раёнах. Спіс мае скразную нумарацыю. У выпадку наяўнасці у адным населеным пункце некалькіх па-

[1] Запісана аўтарам са слоў Лобача У.А. аб палявой этнаграфічнай экспедыцыі: ў в. Варонічы і Мураўшчына Полацкага раёна ў 2005 г.; ў Докшыцкі раён у 2006 г.; у г.п. Ушачы і Царковічша ў 2006 г.; ў в. Наўліца Полацкага раёна ў 2007 г.

[2] Аўтар удзячны Д.У. Дуку, Л.У. Дучыц, М.В. Клімаву, У.А. Лобачу, В.М. Ляўко, З.А. Харытановіч за дазвол выкарыстаць назапашаныя імі матэрыялы.

хавальных помнікаў яны маюць дадатковую нумарацыю. Нумары помнікаў у спісе адпавядаюць нумарам на карце. Улічаны позненсярэднявечныя курганныя пахаванні, курганна-жальнічныя могілкі, магілы з каменнымі надмагіллямі і крыжамі, пахаванні ўнутры культавых пабудоў, а таксама памінальныя курганы.

**Спіс пахавальных помнікаў Беларускага Падзвіння XIV – XVIII стагоддзяў**

| Месца знаходжання, раён | Назвы пахавальных помнікаў |
|---|---|
| | ***Віцебская вобласць*** |
| 1 | 2 |
| **Бешанковіцкі** | 1. Далосцы, в. Курганны могільнік і пахаванні XIX стагоддзя побач з сучаснымі могілкамі. Знакі на надмагільных камянях [14, с. 45, 48].<br>2. Двор-Нізгалова, в. На могілках надмагільныя камяні са знакамі [14, с. 45, 48].<br>3. Жарнасекава, в. Курганныя пахаванні побач з сучаснымі могілкамі. Магілы, упушчаныя ў курганныя насыпы [11, с. 124 – 125].<br>4. Жданава, в. Па дарозе ў в. Шапчына 12 курганоў і каменныя крыжы [9, с. 31].<br>5. Клешчына, в. Курганны могільнік і пахаванні XIX стагоддзя побач з сучаснымі могілкамі. Знакі на надмагільных камянях [14, с. 45, 48].<br>6. Краснікі, в. На могілках каменнае надмагілле з выявамі [14, с. 48].<br>7. Сакорава, в. Па дарозе на в. Суша каменны крыж XVI стагоддзя з надпісам: «1569 г. Тут положена 200 жовнеров во Христу поставил после битвы по» [9, с. 32; 11, с. 128].<br>8. Целепні, в. На могілках старажытныя каменныя крыжы [9, с. 32].<br>9. Шыпулі, в. На могілках каменныя надмагіллі са знакамі [14, с. 48] |
| **Браслаўскі** | 10. Друя, г.п. Меркаваная брацкая магіла перыяду Паўночнай вайны. Выяўлена ў ходзе археалагічных раскопак Л.У. Дучыц [15, с. 11].<br>11. Кузьмаўшчына, в. Познесярэднявечны курган з манетай 1566 г. [11, с. 125; 16, с. 77].<br>12. Манастыр, выспа воз. Неспіш. Падчас археалагічных раскопак Л.У. Дучыц знойдзены рэшткі пахавання і рэчы XVI – XVIII стагоддзяў [17, с. 20].<br>13. Цілеўцы, в. Гарадзішча і каменны могільнік [9, с. 35]. |
| **Верхнядзвінскі** | 14. Балоткі, в. Зараз не існуе, размяшчалася на правабярэжжы Заходняй Дзвіны ніжэй г. Дзісна. Каля вёскі быў камень з надпісам «Сулибор хрьст», які ў 1879 г. перавезены ў Маскву [9, с. 36] |
| **Віцебскі** | 15. Віцебск:<br>15.1. меркаваныя могілкі каля царквы архангела Міхаіла на Замкавай гары ў Віцебску. У ходзе археалагічных раскопак А.П. Сапунова знойдзена 14 пахаванняў [11, с. 131; 18, с. 59];<br>15.2. могільнік на месцы былых саляных складоў XVIII ст. у Віцебску. Выяўлены ў ходзе раскопак В.М. Ляўко і І.А. Цішкіна [11, с. 130];<br>15.3. пахаванні ў сутарэннях Свята-Духаўскай царквы XVII – XIX стст. Раскопкі В.М. Ляўко [11, с. 131];<br>15.4. меркаваны могільнік каля віцебскай Нікольскай царквы. Выяўлены ў ходзе археалагічнага назірання В.М. Ляўко [19, с. 5 – 8];<br>15.5. пахаванні ў віцебскай Благавешчанскай царкве і на могілках каля яе. Выяўлены падчас раскопак Т.С. Бубенькі [11, с. 134];<br>15.6. меркаваныя прыходскія могілкі. Выяўлены ў ходзе археалагічнага назірання В.М. Ляўко [20, с. 16];<br>15.7. могільнік каля Васкрасенскай (Рынкавай) царквы. Выяўлены ў ходзе раскопак В.М. Ляўко [21, с. 219 – 220];<br>15.8. могільнік каля Успенскага сабора. Выяўлены В.М. Ляўко [21, с. 218 – 220];<br>15.9. меркаваныя прыходскія могілкі Введзенскай царквы. Выяўлены В.М. Ляўко [21, с. 218, 221];<br>15.10. пахаванні каля храма Ражаства. Выяўлены ў ходзе археалагічнага назірання В.М. Ляўко [21, с. 112 – 113].<br>16. Дрыколле, в. Рэшткі познесярэднявечных могільнікаў з каменнымі крыжамі са знакамі [11, с. 127].<br>17. Камары, в. Старыя могілкі з каменнымі крыжамі [9, с. 39]. |
| **Гарадоцкі** | 18. Астапковічы, в. Каменныя крыжы на могілках [9, с. 49].<br>19. Аўдзейкава, в. У 3 км на поўнач – могільнік-жальнік XV – XVI стагоддзяў [22, с. 14].<br>20. Бяскатова, в. Курганныя пахаванні побач з сучаснымі могілкамі. Каменныя крыжы [9, с. 45].<br>21. Гарадок, г. Пахаванні каля царквы. Раскопкі В.М. Ляўко [11, с. 132 – 133].<br>22. Дубраўка, в. Рэшткі познесярэднявечнага могільніка-жальніка з каменнымі крыжамі [9, с. 49].<br>23. Кісялі, в. Каля вёскі каменныя крыжы XIV – XVII стагоддзяў [22, с. 1].<br>24. Новы Болецк, в. Рэшткі познесярэднявечнага могільніка з каменнымі крыжамі. Раскопкі В.М. Ляўко [11, с. 127, 136].<br>25. Рудня, в. На могілках каменныя крыжы «паўторнага выкарыстання» з надпісамі [9, с. 49].<br>26. Сцепанавічы, в. На могілках 2 каменных крыжа [3, с. 179].<br>27. Хвошна, в. Жальнік на могілках, 2 каменных крыжа XIV – XVII стагоддзяў [9, с. 50; 22, с. 1]. |

*Працяг табліцы*

| 1 | 2 |
|---|---|
| **Глыбоцкі** | 28. Бабруйшчына, в. Рэшткі познесярэднявечнага могільніка з каменным крыжам [11, с. 127].<br>29. Галубічы, в. Рэшткі познесярэднявечнага могільніка з каменнымі крыжамі [11, с. 127].<br>30. Забор'е, в. Курган з рэшткамі памінання [11, с. 125].<br>31. Зябкі, в.:<br>31.1. старыя могілкі, на якіх маецца каменны крыж;<br>31.2. курганныя групы каля воз. Доўгае (некаторыя курганы абкладзены камянямі), дзве курганныя групы каля в. Царкоўна (курганы абкладзены камянямі);<br>31.3. старыя могілкі каля Васьковічаў [9, с. 43; 11, с. 124 – 125].<br>32. Кішы, в. Рэшткі познесярэднявечнага могільніка з каменнымі крыжамі [11, с. 127].<br>33. Лепляны, в. Магілы, абкладзеныя камянямі, сярод курганных насыпаў [10, с. 40].<br>34. Марцэбыліна, в. Жальнікі, рэшткі познесярэднявечнага могільніка [10, с. 40].<br>35. Нарушова, в. Познесярэднявечныя курганы. Раскопкі Галубовічаў [11, с. 124].<br>36. Перавоз, в. Курганна-жальнічны могільнік [10, с. 38].<br>37. Пліса, в. Сярод курганных насыпаў – магілы, абкладзеныя камянямі [16, с. 78; 10, с. 40].<br>38. Чабаны, в. Нізкія насыпы, абкладзеныя камянямі. Пахаванні XIV стагоддзя [9, с. 62].<br>39. Шо, в. Старыя могілкі з каменнымі надмагіллямі і крыжамі [9, с. 45]. |
| **Докшыцкі** | 40. Асецішча, в. На могілках вялікая колькасць надмагільных камянёў і каменных крыжоў, магілы з абкладкамі [13].<br>41. Беразіно, в. Рэшткі познесярэднявечнага могільніка з каменнымі крыжамі, магілы, абкладзеныя камянямі сярод курганных насыпаў [11, с. 127].<br>42. Ваўча, в. Курганна-жальнічны могільнік [10, с. 38 – 39; 11, с. 126].<br>43. Вітунічы, в. Рэшткі познесярэднявечнага могільніка з каменнымі крыжамі, камень з надпісам [11, с. 127].<br>44. Дамашкавічы, в. Рэшткі познесярэднявечнага могільніка з каменнымі крыжамі [11, с. 127].<br>45. Маргавіца, в. Круглыя магілы, абкладзеныя камянямі [10, с. 40].<br>46. Небышына, в. – Далёкае, в. Урочышча Гарадзішча са старым могільнікам [9, с. 52].<br>47. Слабада, в. Рэшткі познесярэднявечнага могільніка з каменнымі крыжамі [11, с. 127]. |
| **Лепельскі** | 48. Аўгустова, в. Курганна-жальнічны могільнік [11, с. 126].<br>49. Домжарыцы, в. Курганна-жальнічны могільнік [11, с. 126].<br>50. Забалоцце, в. Познесярэднявечны курган з манетай 1569 года. Раскопкі М.Ф. Кусцінскага. Магілы, абкладзеныя камянямі [11, с. 125; 16, с. 77].<br>51. Зацекляссе, в. Чатыры каменных крыжа, у т.л. адзін з выявай [13].<br>52. Камень, в. Курганна-жальнічны могільнік [4, с. 27 – 28; 10, с. 40; 11, с. 126].<br>53. Кветча, в. Могільнік, 195 курганов, некаторыя абкладзены камянямі [9, с. 52].<br>54. Стары Лепель, в.:<br>54.1. познесярэднявечныя могілкі. Раскопкі З.А. Харытановіч;<br>54.2. закінутыя яўрэйскія могілкі [9, с. 58; 27, с. 5].<br>55. Суша, в. Каменны крыж, аналагічны аб'екту № 8, па дарозе ў в. Камень. Надпіс не захаваўся [3, с. 294; 9, с. 59]. |
| **Лёзненскі** | 56. Веляшковічы, в. Паводле А.М. Семянтоўскага, падчас земляных работ для будаўніцтва царквы было знойдзена 49 чалавечых чарапоў, шмат костак [4, с. 28]. |
| **Міёрскі** | 57. Валатоўка, в. Магілы, упушчаныя ў курганныя насыпы. Каменныя надмагіллі [11, с. 124 – 125].<br>58. Вята, в. Познесярэднявечныя могілкі з каменнымі крыжамі [11, с. 127].<br>59. Спігальшчына, в. Курганна-жальнічны могільнік [10, с. 40; 11, с. 126].<br>60. Стары Пагост, в. Магілы, абкладзеныя камянямі, сярод курганных насыпаў [10, с. 40].<br>61. Чамяры, Чурылава, вв. Памінальныя курганы [11, с. 125; 20, с. 78]. |
| **Полацкі** | 62. Бяздедавічы. Старажытныя могілкі побач з храмам [11, с. 130].<br>63. Варонічы, в. Тры крыжы на могілках [24, с. 267].<br>64. Ветрына, г.п. Каменны крыж з надпісам «Иоанко Неманушкевичъ». Каля яго знойдзена манета Міхаіла Фёдаравіча першай паловы XVII стагоддзя [11, с. 128].<br>65. Мураўшчына, в. На могілках крыж з кірылічным надпісам [12; 25, с. 13].<br>66. Наўліца, в. Каменны крыж на могілках [15].<br>67. Нача, в. Курганы, абкладзеныя камянямі [9, с. 72].<br>68. Полацк, г.:<br>68.1. могілкі каля Сафійскага сабора [11, с. 130 – 131];<br>68.2. пахаванні ў сутарэннях Сафійскага сабора [11, с. 131];<br>68.3. пахаванні на востраве р. Заходняя Дзвіна. Шурфоўка Л.Д. Побаля [26, с. 10 – 11];<br>68.4. могілкі дамініканскага кляштара. Раскопкі С.В. Тарасава [27, с. 210 – 211];<br>68.5. могілкі Багаяўленскага манастыра. Выяўлены ў час археалагічнага назірання Д.У. Дукам [27, с. 211];<br>68.6. пахаванні на тэрыторыі былога езуіцкага калегіума. Выяўлены ў час археалагічнага назірання Д.У. Дукам [27, с. 211]; |

*Заканчэнне табліцы*

| 1 | 2 |
|---|---|
| **Полацкі** | 68.7. пахаванні ў сутарэннях Спаса-Праабражэнскай царквы. Раскопкі Д.У. Дука [28];<br>68.8. могілкі на полацкім гарадзішчы. Раскопкі Д.У. Дука [29, с. 6 – 12];<br>68.9. пахаванне на «стрэлцы» Ніжняга замка. Раскопкі Д.У. Дука [30].<br>69. Туржэц 2, в. Познесярэднявечны могільнік. Раскопкі Д.У. Дука [24].<br>70. Хацевічы, в. Каменны крыж на могілках [15; 25, с. 12].<br>71. Экімань, в.:<br>71.1. каменныя крыжы на могілках [9, с. 72];<br>71.2. пахаванні, выяўленыя ў ходзе археалагічных разведак Д.У. Дука [31, с. 4 – 12]. |
| **Сенненскі** | 72. Белая Ліпа, в. Каля дарогі Сянно – Віцебск – каменны крыж са знішчаных старых могілак [33, с. 12].<br>73. Замошша, в. Познесярэднявечныя могілкі [32, с. 12]. |
| **Ушачскі** | 74. Глыбачка, в. Магілы, абкладзеныя камянямі [24, с. 267; 25, с. 12].<br>75. Кублічы, в. Магілы, абкладзеныя камянямі [9, с. 84; 10, с. 39].<br>76. Ляхі, в. Магілы, абкладзеныя камянямі, сярод курганных насыпаў [10, с. 40].<br>77. Павулле, в. Курганы, абкладзеныя камянямі [9, с. 85].<br>78. Пуцілкавічы, в. Курганы, жальнікі. Пахаванне XII – XIV стагоддзя [9, с. 85; 10, с. 39; 33, с. 234].<br>79. Стайкі, в. Могілкі з каменнымі надмагіллямі [14]. |
| **Чашніцкі** | 80. Горы, в. Познесярэдневяковыя курганы [9, с. 87; 11, с. 124; 16, с. 78].<br>81. Лукомль, в. Рэшткі познесярэднявечных могілак з каменнымі крыжамі [11, с. 127].<br>82. Слідцы, в. Курганы, каменныя крыжы [9, с. 89]. |
| **Шаркаўшчынскі** | 83. Лужкі, в. Каменныя пліты і драўляныя надмагіллі – прыклады і церамкі. Зафіксавана В.Ю. Ластоўскім [11, с. 128]. |
| **Шумілінскі** | 84. Вайловічы, в. Курганападобныя насыпы XIV – XV стагоддзяў, рэшткі жальніка [3, с. 283; 32, с. 9].<br>85. Мішневічы, в. Познесярэднявечны каменны крыж [36, с. 8]. |
| ***Мінская вобласць*** | |
| **Барысаўскі** | 86. Дзедзелавічы, в. Курганна-жальнічны могільнік [11, с. 126].<br>87. Смаляры, в. Курганна-жальнічны могільнік [11, с. 126].<br>88. Хаўхоліца, в. Курганна-жальнічны могільнік [11, с. 126]. |
| **Лагойскі** | 89. Гайна, в. Старажытны могільнік побач з храмам [11, с. 130]. |

Для лакалізацыі аб’ектаў былі выкарыстаны карты Беларускай ССР 1980-х гадоў выдання маштабу 1:100000 [12]. У асобных выпадках выкарыстоўвалася Польская тактычная карта Вайсковага геаграфічнага інстытута 1919 – 1939 гадоў маштабу 1:100000 [13]. Вынікам стала «Карта пахавальных помнікаў Беларускага Падзвіння XIV – XVIII стагоддзяў» ( мал. 2).




Мал. 2. Карта пахавальных помнікаў Беларускага Падзвіння XIV – XVIII стагоддзяў
(нумары на карце адпавядаюць нумарам у спісе пахавальных помнікаў Беларускага Падзвіння XIV – XVIII стст.)

**Заключэнне.** У выніку падсумавання інфармацыі аб вядомых пахавальных помніках Беларускага Падзвіння XIV – XVIII стагоддзяў быў складзены іх спіс. Картаграфаванне аб'ектаў паказала, што найбольшая канцэнтрацыя сельскіх пахавальных помнікаў назіраецца на левабярэжжы Заходняй Дзвіны. Асабліва шчыльна пахаванні размешчаны на тэрыторыі сучасных Бешанковіцкага, Глыбоцкага, Докшыцкага, Лепельскага і Полацкага раёнаў. На правым беразе Заходняй Дзвіны па колькасці помнікаў на першым месцы знаходзіцца Гарадоцкі раён. На тэрыторыі Верхнядзвінскага, Лёзненскага, Сенненскага, Чашніцкага, Шаркаўшчынскага і Шумілінскага раёнаў пахавальных помнікаў значна менш, а на тэрыторыі Расонскага і Пастаўскага раёнаў іх увогуле не выяўлена. Гэта можа быць абумоўлена неаднолькавай шчыльнасцю насельніцтва з прычыны розных прыродных умоў (забалочанасць, неўрадлівасць глебы), а таксама рознай ступенню археалагічнай даследаванасці тэрыторый. Прапануемую карту пахавальных помнікаў Беларускага Падзвіння XIV – XVIII стагоддзяў плануецца карэктаваць з улікам новых археалагічных адкрыццяў.

ЛІТАРАТУРА


1. Цітоў, В. Падзвінне / В. Цітоў // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелЭн, 1993 – 2003. – Т. 5: М – Пуд, 1999. – 372 с.
2. Цітоў, В.С. Этнаграфічная спадчына: Беларусь: Краіна і людзі / В.С. Цітоў. – 2-е выд. – Мінск: Беларусь, 2001. – 208 с.
3. Алексеев, Л.В. Археологические памятники эпохи железа в среднем течении Западной Двины (материалы к археологической карте Витебской области БССР) / Л.В. Алексеев // Труды Прибалтийской объединенной комплексной экспедиции; под общ. ред. Х.А. Моора [и др.]; под ред. С.А. Таракановой [и др.]. – М.: Акад. наук СССР, 1959. – Т. 1: Вопросы этнической истории народов Прибалтики по данным археологии, этнографии и антропологии. – С. 273 – 315.
4. Сементовский, А.М. Белорусские древности / А.М. Сементовский. – СПб., 1890. – Вып. 1. – 136 с.
5. Покровский, Ф.В. Археологическая карта Виленской губернии / Ф.В. Покровский – Вильна: Тип. А.Г. Сыркина, 1893. – XVIII с.+164 с.
6. Покровский, Ф.В. Археологическая карта Ковенской губернии / Ф.В. Покровский. – Вильна: Тип. А.Г. Сыркина, 1899. – 161 с.
7. Романов, Е.Р. Краткие указания для совершения археологических экскурсий средними учебными заведениями Виленского учебного округа / Е.Р. Романов. – 14 с.
8. Мялешка, М. Апытальны ліст да зьбіраньня народных вераванняў і прадстаўленняў, звязаных з каменем, і вестак аб каменных помніках гісторыка-архэолёгічнае значнасьці / М. Мялешка // Наш край. – 1926. – № 1. – С. 43 – 47.
9. Штыхов, Г.В. Археологическая карта Белоруссии. Памятники железного века и эпохи феодализма / Г.В. Штыхов. – Минск: Полымя, 1971. – Вып. 2. – 276 с.
10. Дучыц, Л.У. Курганна-жальнічныя могільнікі на тэрыторыі Полацкай зямлі (да пастаноўкі пытання) / Л.У. Дучыц // Гістарычна-археалагічны зборнік. – 1996. – № 10. – С. 38 – 42.
11. Археалогія Беларусі: у 4 т. – Мінск: Беларус. навука, 1998 – 2001. – Т. 4: Помнікі XIV – XVIII стст. / В.М. Ляўко [і інш.]; пад рэд. В.М. Ляўко [і інш.]. – 2001. – 597 с.
12. Беларусь. Топографическая карта 1:100000 // [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://info.poehali.net/ /c00002/1/, свабодны. – Загл. з экрана.
13. Archiwum map Wojskowego Instytutu Geograficznego 1:100000 // [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://polski.mapywig.org/viewpage.php?page_id=7/, свабодны. – Загл. з экрана.
14. Лобач, У. Да вынікаў археалагічна-этнаграфічнай экспедыцыі ў мястэчку Бачэйкава і яго ваколіцах / У. Лобач // Матэрыялы II міжнар. канф. па праблемах музеефікацыі унікальных гістарычных тэрыторый. – Полацк, 1996. – С. 45 – 48.
15. Дучиц, Л.В. Отчет о раскопках в г.п. Друя и г. Верхнедвинске в 1986 г. / Л.В. Дучиц, О.Е. Зайцева // Архіў Інстытута гісторыі НАН Беларусі. – Воп. 1. – Спр. № 950.
16. Дучыц, Л. Познесярэдневяковыя курганы Беларуси / Л. Дучыц // Гістарычна-археалагічны зборнік. – 1997. – № 12. – С. 77 – 79.
17. Дучиц, Л.В. Отчет о полевых исследованиях в среднем течении бассейна Западной Двины и в Щучинском и Слонимском районах Гродненской области в 1982 г. / Л.В. Дучиц // Архіў Ін-та гісторыі НАН Беларусі. – Воп. 1. – Спр. № 811.
18. Калядзінскі, Л.У. Віцебскі храм св. Міхаіла / Л.У. Калядзінскі // Весці Акад. навук Беларусі. Серыя грамадскіх навук. – 1995. – № 1. – С. 59 – 66.
19. Левко, О.Н. Отчет об археологическом наблюдении во время земляных работ на объекте «Реконструкция ресторана «Хата лесника» в г. Витебске в 2005 г.» / О.Н. Левко // Архіў Ін-та гісторыі НАН Беларусі. – Воп. 1. – Спр. № 2314.

20. Левко, О.Н. Отчет об археологическом наблюдении на объекте «Узел входящих/исходящих сообщений-3 г. Витебск» в 2007 г.» // Архіў Ін-та гісторыі НАН Беларусі. – Воп. 1. – Спр. № 2491.
21. Левко, О.Н. Витебск / О.Н. Левко; НАН Беларуси, Ин-т истории. – Минск: Беларус. навука, 2010. – 335 с.
22. Левко, О.Н. Отчет об обследовании памятников археологии Городокского района Витебской области, Шкловского района Могилёвской области, Несвижского района Минской области в 1985 г. // Архіў Ін-та гісторыі НАН Беларусі. – Воп. 1. – Спр. № 942.
23. Харытановіч, З.А. Справаздача аб археалагічных даследаваннях на тэрыторыі Лепельскага і Бешанковіцкага раёнаў Віцебскай вобласці ў 2008 годзе / З.А. Харытановіч // Архіў Ін-та гісторыі НАН Беларусі. – Воп. 1. – Спр. № 2578.
24. Дук, Д.У. Археалагічныя раскопкі на грунтовым могільніку Туржэц 2 Полацкага раёна / Д.У. Дук // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. Вып. 15. – Минск, 2008. – С. 261 – 285.
25. Клімаў, М. Справаздача за 1996 г. аб археалагічных даследаваннях у Полацку і Полацкім раёне / М. Клімаў // Архіў Ін-та гісторыі НАН Беларусі. – Воп. 1. – Спр. № 1622.
26. Поболь, Л.Д. Отчет об обследовании археологических памятников в г. Полоцке в 1959 г. / Л.Д. Поболь // Архіў Ін-та гісторыі НАН Беларусі. – Воп. 1. – Спр. № 112.
27. Дук, Д.У. Полацк XVI – XVIII стагоддзяў: нарысы тапаграфіі, гісторыі матэрыяльнай культуры і арганізацыі жыццёвай прасторы насельніцтва беларускага горада / Д.У. Дук. – Наваполацк: ПДУ, 2007. – 268 с.
28. Дук, Д.У. Справаздача аб археалагічных раскопках і наглядзе ў горадзе Полацку ў 2005 годзе / Д.У. Дук // Архіў Ін-та гісторыі Нац. Акад. навук Беларусі. – Воп. 1. – Спр. № 2284.
29. Дук, Д.У. Справаздача аб археалагічных раскопках на полацкім гарадзішчы ў 2007 г.: у 2 ч. / Д.У. Дук // Архіў Ін-та гісторыі НАН Беларусі. – Ч. 1: Тэкст; Ч. 2: Фотаздымкі і ілюстрацыі. – Воп. 1. – Спр. № 2537.
30. Дук, Д.У. Справаздача аб археалагічных раскопках на Ніжнім замку Полацка ў 2008 г. / Д.У. Дук // Архіў Ін-та гісторыі НАН Беларусі. – Воп. 1. – Спр. № 2600.
31. Дук, Д.У. Справаздача аб археалагічных даследаваннях на левабярэжных пасадах Полацка ў 2009 г. / Д.У. Дук // Архіў Ін-та гісторыі НАН Беларусі. – На разглядзе ў Палявым камітэце.
32. Дучиц, Л.В., Отчёт о раскопках в Миорском районе Витебской области и разведках на территории Белоруссии 1985 г. // Архіў Ін-та гісторыі НАН Беларусі. – Воп. 1. – Спр. № 908.
33. Ляўданскі, А. Кароткае паведамленьне аб досьледах культур эпохі жалеза ў БССР у 1930 – 1931 гг. / А. Ляўданскі // Працы сэкцыі архэолёгіі. – Мінск, 1932. – Т. 3. – С. 230 – 235.

*Пастуніў 30.03.2010*

## MATERIALS TO THE MAP OF FUNERAL MONUMENTS IN BELARUSSIAN DVINA REGION OF THE 14 – 18 CENTURIES

***V. CHARAUKO***

*Funeral monuments are the integral part of the material and spiritual culture. Their study gives an opportunity to get the information about special features of a burial custom, its dependence on the buried person's social and religious status. Funeral monuments from 14 – 18 centuries in Belarussian Dvina region are almost unexplored. The necessary part of their study is the mapping. A map of funeral monuments gives the opportunity to analyze them visually: to see the mutual location, to draw conclusions about their localization according to the nature objects, to expose the districts of maximal concentration. The article deals with the question of mapping of funeral monuments in Belarussian Dvina region in 14 – 18 centuries. The preparatory period preceded the mapping, the borders of the studied region were specified and the information about the known archeological objects was systematized. As a result the list of funeral monuments was formed, it counts about one hundred positions. The result of mapping of the known objects is "Map of the funeral monuments in Belarussian Dvina region in 14 – 18 centuries", which will be specified after new discoveries.*